КОЛИЗЕЙ

Отпустите меня!
Отпустите меня!
Отпустите!
Не хочу я подарков,
не надо мне травли зверей.
И какая беда,
что один поубавится зритель
В миллионной толпе,
заполняющей ваш Колизей!
Императорский Рим!
Ты теряешь своих прозелитов,
И от вас, о квириты,
давно отвернулась судьба.
И на этой арене,
бессмысленно кровью залитой,
Ваша древняя доблесть
сменяется стоном раба.
И чужое безумье
становится символом веры
Для того, кто сегодня
вопит исступленно «Убей!»
Отпустите меня,
отпустите меня, изуверы!
Не хочу я подарков,
не надо мне травли зверей.

Александр Немировский

АіВ
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Серыя "У дапамогу педагогу"
заснавана ў 1995 годзе па ініцыятыве У.П.Пархоменкі

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

ГІСТОРЫЯ

праблемы выкладання

№ 2 (22) ' 2002

Заснавальнік і выдавец – Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"

Рэдакцыйная калегія

Галоўны рэдактар
М.І.Мініцкі

Намеснік галоўнага рэдактара
Н.М.Ганушчанка

Адказны сакратар
Л.В.Саламаха

Члены рэдкалегіі
І.І.Багдановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
У.М.Міхнюк
С.В.Паноў
М.С.Сташкевіч
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава
А.А.Яноўскі

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: (017) 229-19-71,
факс: (017) 220-54-10

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ

ТЭОРЫЯ І МЕТАДАЛОГІЯ

Тугай Уладзімір. Арганізацыя сістэмы адукацыі і культурна-асветніцкая дзейнасць у латышскіх калоніях БССР і Заходняй вобласці (20—30-ыя гады) 3

ДЫДАКТЫКА І ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ

Вабішчэвіч Віктар. Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне вучняў у працэсе выкладання гісторыі Беларусі 19
Федкович Анна. К вопросу развития школьного образования в БССР (конец 50-х – начало 70-х гг. XX в.) 28
Гимбут Владимир. Реализация задач национально-просветительной политики среди национальных меньшинств в 1920-е годы 39
Кошелева Наталья. Ислам в США 47
Смирнов Артем. Стадии развития человечества 65
Навіцкі Васіль, Кузьмін Сяргей. Фрыгійскі вузел 72
Козикова Ирина. Дидактические возможности школьного курса истории в формировании правовых знаний 79

НАВУКОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Якім быць падручніку па гісторыі? З пасяджэння «круглага стала» 98

АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПАРАДЫ

Секацкая Клавдия. Всемирная история. 7 и 8 классы 106

ДАВЕДАЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

Гонцова Светлана, Миницкий Николай, Панов Сергей, Филимонов Алексей. Понятийно-терминологический словарь-справочник по истории 125

РЭДАКЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Да ведама аўтараў 127

© "Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне", 2002
© Вокладка К.К.Шастоўскага, 2002

ТЭОРЫЯ І МЕТАДАЛОГІЯ

Уладзімір Тугай, кандыдат гістарычных навук, дацэнт БДПУ імя Максіма Танка

Арганізацыя сістэмы адукацыі і культурна-асветніцкая дзейнасць у латышскіх калоніях БССР і Заходняй вобласці (20—30-ыя гады)

Выбар рэгіёна ў плане пастаўленай праблемы вельмі цікавы і важны. Беларусь мае глыбокія гістарычныя карані з Расіяй і Латвіяй. У XVIII—XX стст. у выніку войнаў і значных сацыяльных з'яў адбываліся дэмаграфічныя перамяшчэнні, у выніку якіх нацыянальны склад у Беларусі мяняўся. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі значная частка тэрыторыі Беларусі (Віцебская, Магілёўская і Мінская губерні) увайшлі ў склад Заходняй вобласці (камуны) з цэнтрам у Смаленску. Пасля стварэння БССР і да другой паловы 20-ых гадоў паміж Беларуссю і Расіяй ішоў працэс удасканалення мяжы. І толькі ў 1929 г. была створана новая Заходняя вобласць у складзе Смаленскай, Бранскай, Калужскай і некаторых раёнаў Цверскай і Арлоўскай губерняў. Перасяленчы рух латышоў пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ходзіў праз Віцебскую і Магілёўскую губерні, Смаленск і далей на ўсход. Да таго ж у гады Першай сусветнай вайны вялікая колькасць латышоў разам з прамысловымі прадпрыемствамі была эвакуіравана ў Смаленск і прылеглыя раёны.

Сярод праблем, якія царская Расія пакінула новаму грамадству ў сферы міжнацыянальных адносін, адной з самых складаных была арганізацыя навучання прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей на іх роднай мове. На пасяджэнні калегіі Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей ад 20 чэрвеня 1918 г. адзначалася: "...Арганізацыя і вядзенне школьнай і пазашкольнай справы сярод асобных нацыянальнасцей знаходзіцца ў распараджэнні Наркамата асветы. Пры садзейнічанні і ўдзеле Наркамнаца ўтвараецца нацыянальная секцыя, куды ўваходзяць з правам рашаючага голасу па адным прадстаўніку ад ўсіх нацыянальнасцей, камісарыятаў і аддзелаў пры Наркамнацы. Нацыянальная секцыя вылучае са свайго асяроддзя рабочы апарат, які дзейнічае па агульным плане работы аддзелаў Наркамата асветы. У кампетэнцыю нацыянальнай секцыі ўваходзіць разгляд пытанняў, якія маюць дачыненне да асветы і фінансавання школьнай і пазашкольнай адукацыі сярод асобных нацыянальнасцей» [1].

Трэба адзначыць, што латышоў яшчэ з часоў перасялення хвалявала пытанне пісьменнасці сваіх дзяцей. Нягледзячы на хутарскі вобраз жыцця, што надавала цяжкасці ў наведванні навучальных устаноў, латышы спрабавалі адкрыць навучальныя ўстановы і забяспечыць іх настаўнікамі. Прыкладаў таму шмат. У пачатку XX ст. у Вялішковічах, што на Лёзненшчыне, існавала царкоўнапрыходская школа для дзяцей латышоў [2]. Подобныя школы ствараліся ў Клімавіцкім, Быхаўскім і іншых паветах.

Важнае значэнне падчас Першай сусветнай вайны мела дзейнасць «Таварыства дапамогі сем'ям латышоў-латгальцаў, якія ўдзельнічалі ў вайне, і бядотнаму насельніцтву Латгаліі, што пацярпела ад ваенных дзеянняў у гарадах Віцебскай губерні». Яго заснавальнікамі былі рэдактар латгальскай газеты "Дрыва" Казімір Скрында, старшыня таварыства "Гайспа" Франц Кемпіш, намеснік старшыні Латгальскага таварыства ўзаемнай дапамогі Ів.Волант. Дзейнасць таварыства цалкам адпавядала яго дабрачынным мэтам.

Аддзелы таварыства былі адкрыты ў Рэжыцы, Дзвінску, Люцыне, у мястэчках Дагда, Лівенгоф, сёлах Бродайжы, Драцаны, Райколь і інш. [3]. Яны мелі права адкрываць школы-прытулкі. З лютага 1916 г. такая школа з'явілася ў сяле Элеонвіль. У школе-прытулку Борхаўскага аддзялення Латгальскага таварыства жылі 45 дзяцей. На іх утрыманне да 1 верасня 1916 г. было выдаткавана 3893 рублі, якія пайшлі на набыццё вучэбных дапаможнікаў, адзення, аказанне медыцынскай дапамогі і г.д. Сродкі для школ-прытулкаў таварыствы атрымлівалі з камітэта вялікай князёўны Таццяны Мікалаеўны (Таццянінскі камітэт) [4].

Для вырашэння шматлікіх нацыянальных праблем бальшавікі стварылі Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей. Адначасова ў рэгіёнах з неаднастайным нацыянальным складам пры губернскіх камітэтах РКП(б) і пры выканкамах губернскіх і павятовых Саветаў ствараліся адпаведныя аддзелы (секцыі ці бюро) па справах нацыянальнасцей [5]. Пры Віцебскім губвыканкаме быў створаны Губаднац, які складаўся спачатку з двух пададдзелаў — яўрэйскага і латышскага, а з лютага 1922 г. і польскага [6].

Паступова з мэтай пашырэння працы сярод нацменшасцей пры Віцебскім ГубАНА былі створаны нацыянальныя секцыі. Латышская секцыя ўтварылася ў снежні 1922 г. [7]. Пры ГубАНА акрамя секцый з вясны 1922 г. узнікалі калегіі, у якія ўваходзілі і прадстаўнікі нацыянальных секцый пры аддзелах прафесійнай адукацыі і сацыялістычнага выхавання. Рабілася гэта таму, што мэты апошніх былі ў асноўным аднолькавыя і існавала неабходнасць у дасягненні скаардынаванасці іх дзеянняў.

На прыкладзе Віцебшчыны бачна, як савецкая ўлада імкнулася задаволіць нацыянальныя інтарэсы ў галіне культуры і асветы найбольш буйных іншаэтнічных груп. Паводле перапі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

су насельніцтва 1920 г. латышы складалі 0,89% ад агульнай колькасці насельніцтва Віцебскай губерні [8].

У дакументах Губаднаца адзначаецца, што трэба праводзіць спецыфічную культурна-асветніцкую работу сярод нацменшасцей "з мэтамі хутчэйшага ўцягнення гэтых народаў у сацыялістычнае будаўніцтва" [9].

Практычная работа па арганізацыі нацыянальных школ пачала праводзіцца ў першыя гады савецкай улады таксама пададдзеламі па асвеце нацыянальных меншасцей пры аддзелах народнай адукацыі мясцовых Саветаў. Яны былі закліканы абараняць інтарэсы нярускіх народаў у школе, садзейнічаць узнікненню і функцыянаванню нацыянальных тэхнікумаў, дашкольных устаноў, лікбезаў. У сістэме мер па развіцці нацыянальнай адукацыі былі і такія, як браніраванне месцаў для нацыянальных меншасцей у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, на рабфаках.

Работу латышскіх школ Віцебскай губерні каардынавала латышская секцыя ГубАНА, у паветах жа спецыяльных органаў не было, што негатыўна адбілася на развіцці латышскай нацыянальнай школы. У 1923/24 навучальным годзе ў справаздачы для Віцебскага губвыканкама работнікі латсекцыі ГубАНА канстатавалі, што "арганізаваць і адкрыць новыя школы ў паветах у бліжэйшай будучыні не ўяўляецца магчымым з-за адсутнасці школьных работнікаў... востра стаіць пытанне аб вучэбных дапаможніках, якія нельга купіць нават за грошы" [10].

Такая ж карціна назіралася ў Магілёўскай і Мінскай губернях, дзе з-за недахопу настаўнікаў спрабавалі закрыць шэраг латышскіх школ [11]. Толькі пасля ўмяшання Магілёўскага акругкама ўдалося адстаяць ад закрыцця Лашнёўскую латышскую сямігадовую школу [12].

У 1922/23 навучальным годзе на Віцебшчыне захавалася 9 школ 1-ай ступені, 1 школа 2-ой ступені, 1 дзіцячы дом. У гэтых установах з цяжкасцю, але адбылося ўкамплектаванне педкадрамі. Дарэчы, латышскія школы Віцебскай акругі штогод атрымлівалі толькі трох настаўнікаў з педтэхнікума, хаця патрэба

ў іх была значна большай [13]. У 1924/25 навучальным годзе ў Беларусі налічвалася 14 латышскіх школ, у якіх працавалі 23 настаўнікі і навучалася 477латышскіх дзяцей [14].

На тэрыторыі Унаўскага сельсавета на Віцебшчыне ў вёсцы Уна пры калгасе "Бязбожнік" працавала Усебеларуская латышская трохгадовая школа вясковай моладзі, дзе навучаліся 22 вучні ад 13 да 18 гадоў. У школе выкладалі тры настаўнікі. Са справаздачы дырэктара латышскай школы Біркана ад 15 верасня 1928 г.: "Арэнда школы на год каштуе 160 рублёў. Ацяпленне школа атрымлівае за ўласныя сродкі. З раёна атрыманы неабходныя прылады. Школа пачала працаваць без дастатковай колькасці вучэбных дапаможнікаў. Адчуваецца недахоп падручнікаў, плакатаў і карт на латышскай мове". Акрамя гэтага, тут працавала аднакамплектная латышская школа агульнай плошчай 48 кв. метраў, дзе навучалася 26 чалавек ад 8 да 13 гадоў [15].

У вёсцы Матушава Сутокскага сельсавета таксама на Віцебшчыне пры сельскагаспадарчай камуне "Інтэрнацыянал" на бюджэце сельсавета працавала латышская школа плошчай 28 кв. метраў, дзе навучаліся 18 чалавек ва ўзросце 8–9 гадоў. Навучанне праходзіла на латышскай, беларускай і рускай мовах. У вёсцы Барсеева пры калгасе "Чырвоны араты" ў латышскай аднакамплектнай пачатковай школе вучыліся 18 дзяцей. Пры ёй былі цяслярныя майстэрні і зямельны надзел у паўтара гектара.

У вёсцы Чарніца пры калгасе "Адказ ворагам" функцыянавала чатырохгадовая латышская Савецкая Працоўная школа 1-ай ступені (21 вучань), якая займала канфіскаванае пры раскулачванні памяшканне. Выкладанне вялося на латышскай і беларускай мовах [16].

15 мая 1919 г. на пасяджэнні Калегіі Смаленскага губернскага аддзела народнай адукацыі (ГубАНА) была прынята спецыяльная пастанова аб арганізацыі пры ім пададдзела нацменшасцей. У пастанове, у прыватнасці, гаварылася: "Прызнаць арганізацыю пададдзела неабходнай, прапанаваць нацыя-

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

нальным пралетарскім арганізацыям вылучыць са свайго асяроддзя калегію пададдзела, прадставіўшы на зацвярджэнне ГубАНА план работы, а таксама персанальна вызначанага загадчыка пададдзела меншасцей" [17].

Пра сапраўды зацікаўленую працу па нацыянальнай адукацыі ў гэты час сведчаць шматлікія факты. Яшчэ да стварэння пададдзела на Смаленшчыне дзейнічалі польскія, літоўскія, яўрэйскія школы. Пры ім былі створаны секцыі — польскія, латышскія, яўрэйскія, пазней — беларускія. У 1919 г. пры пададдзеле арганізоўваецца калегія для вырашэння бягучых спраў, якая, да прыкладу, займалася падрыхтоўкай да Усесаюзнай нарады нацыянальнасцей, прызначанай на 10 жніўня 1919 г., а таксама іншымі аператыўнымі пытаннямі. Дакументы прымушалі "...сельскія Саветы паляпшаць сваё кіраўніцтва нацыянальна-культурнымі ўстановамі..., дапамагаючы нацменам у справе абсталявання, забеспячэння падручнікамі, дровамі і г.д." [18].

Пры Гомельскім губкаме РКП(б) у 1919 г. таксама былі створаны яўрэйская, латышская, польская секцыі [19].

У 20-ыя гады шмат увагі надавалася задавальненню культурных патрэб розных нацменшасцей. І хаця найбольш важнай палітычнай задачай па-ранейшаму заставалася беларусізацыя, кіруючыя колы рэспублікі актыўна падтрымлівалі запатрабаванні іншых народаў.

Матэрыялы прафсаюзнай камісіі па ажыццяўленні нацыянальнай работы, справаздачы пра дзейнасць Латышскага бюро ЦК КП(б)Б, рэзалюцыі І Усебеларускага з'езда сялян-латышоў (1924) даюць цікавую і аб'ектыўную карціну культурнага будаўніцтва ў латышскіх пасяленнях. А работа была немалая — ужо ў 1926 г. існавала 17 латышскіх школ, якія абслугоўвалі 35% дзяцей латышоў школьнага ўзросту; астатнія наведвалі беларускія школы [20]. У 1926/27 навучальным годзе латышскімі школамі было ахоплена 675 дзяцей. Ва ўсіх працоўных школах навучалася 940 вучняў-латышоў [21]. Вельмі напружанае становішча было з падручнікамі, таму што сваёй выдавецкай базы не існавала. Іх друкавалі ў Маскве, куплялі

за мяжой. Сямігадовая латышская школа тады знаходзілася ў Віцебску, 16 школ былі чатырохгадовыя. Размяшчаліся па акругах: 5 — у Віцебскай, 3 — у Магілёўскай, 2 — у Полацкай [22]. Народным камісарыятам асветы Беларусі праводзілася работа па ліквідацыі непісьменнасці і ўліку пісьменнага насельніцтва па нацыянальнасцях. Цікава параўнаць узровень пісьменнасці сярод нацыянальнасцей, якія жылі ў той час на Беларусі. Вось, напрыклад, звесткі пра тры з іх, узятыя з матэрыялаў камісіі па нацыянальным пытанні ў 1924 г.

Нацыянальнасць	Усяго пісьменных	Непісьменных
Беларусы	1 467 767	2 549 534
Яўрэі	280 466	126 593
Латышы	10 356	3 605

Звесткі перапісу насельніцтва 1926 г. даюць цікавую карціну пісьменнасці насельніцтва Беларусі: беларусы — 36%, яўрэі — 70, рускія — 49, палякі — 50, украінцы — 43, латышы — 74, літоўцы — 61% [23].

Як відаць з дакументаў, латышы ў Беларусі былі самым пісьменным насельніцтвам. Калі ўспомніць, што большасць іх жыла ў сельскай мясцовасці, то становіцца зразумела, чаму квітнелі гаспадаркі ў перасяленцаў. Невысокая ступень эксплуатацыі наёмных рабочых нарадзіла іх дабрабыт, а высокая культура вытворчасці – глыбокія веды, спрытнасць у вядзенні спраў.

Безумоўна, што высокі ўзровень адукацыі, культуры латышскіх гаспадароў абумовілі неадназначныя адносіны да іх з боку новай улады. Самым яскравым доказам таму служыць справаздача аб рабоце латбюро ЦК КП(б)Б за 1926 г. Паколькі такія справаздачы не друкаваліся, іх не закранула цэнзура, то на аснове іх ёсць магчымасць прасачыць поўны драматызму лёс гэтага працавітага народа.

Вось вытрымкі з справаздачы: "Латнасельніцтва ў Беларусі не карэннае. З'явілася галоўным чынам у 60—90-я гады

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мінулага стагоддзя. Большасць з іх — памешчыцкія батракі нямецкіх паноў".

"Адметныя рысы латпрацы ў тым, што яе даводзілася весці ў вёсцы сярод досыць культурнага, але палітычна не зусім настроенага ў бок савецкага будаўніцтва сярэдняга сялянства, мала ўцягнутага ў савецкае будаўніцтва, распыленага па хутарах".

"Настрой (латышскіх сялян) характарызуецца слабым удзелам у савецкім будаўніцтве, тактыкай чакання з прымессю незадавальнення", не выключаючы серадняковў і беднякоў па цэлым шэрагу прычын:

1) Аб'яўленне зямлі маёмасцю дзяржавы і збор з яе падатку, часам празмерна цяжкага, таму што сяляне заплацілі выкуп памешчыку за зямлю і лічылі яе сваёй уласнасцю;

2) Адносіны мясцовага насельніцтва да латсялянства аднолькавыя, як і да кулацтва.

У выніку гэтага латнасельніцтва не адчувае сябе раўнапраўнымі грамадзянамі БССР і чакае змены ў дзяржаве" [24].

Вялікую зацікаўленасць у адкрыцці школ праяўляла латышская секцыя Смаленскай губерні, у справаздачы якой гаварылася: "У цэнтры працы секцыі ў 1919 годзе было абследаванне латышскіх калоній і арганізацыя ў іх культурна-асветніцкіх устаноў... Адкрыліся школы ў наступных калоніях: Гольцаўскай, Ракітаўскай, Лоінскай, Пірагоўскай. Прыняты на ўлік... створаныя раней школы ў Парэцкім, Бельскім, Духоўшчынскім паветах... Прыступілі да рамонту школьных будынкаў..., зроблены закупкі сталярных і слясарных інструментаў для вясковых школ. У бліжэйшы час намецілі: абследаваць калоніі, склікаць губернскую канферэнцыю па народнай адукацыі латышскага насельніцтва, зрабіць закупку навучальных дапаможнікаў і кніг для бібліятэк, правесці мабілізацыю школьных работнікаў-латышоў для працы ў школе і сабраць звесткі пра латышскае насельніцтва Смаленскай губерні» [25].

Калі канчаткова было вырашана пытанне фарміравання тэрыторыі Беларусі (1926), ЦК ВКП(б) даручыў ЦК КП(б)Б прыняць усе неабходныя меры для таго, каб правы нацыянальных

меншасцей на Беларусі былі забяспечаны поўнасцю, каб школы і іншыя культустановы для нацменшасцей былі абавязкова гарантаваны на роднай мове і элементы прымусовай беларусізацыі былі безумоўна ліквідаваны [26].

Да 1925 г. на Смаленшчыне існавала 17 нацыянальных школ. Сетка іх планамерна пашыралася: "1925/26 навучальны год — 19 школ, 1926/27 — 28, 1927/28 — 62" [27]. Пры гэтым адзначалася: "Не ўсе 62 школы з'яўляюцца сапраўды нацменаўскімі, таму што частка з іх... вядзе выкладанне на рускай мове... Так, напрыклад, у Рослаўльскім павеце выяўлена, што з 16 беларускіх школ толькі 8 працуюць на беларускай мове» [28]. Звесткі пра колькасць нацыянальных школ у Смаленскай губерні перад раянаваннем (1928/1929) наступныя: беларускіх школ першай ступені — 36, яўрэйскіх — 12, латышскіх — 10, польскіх — 2, літоўскіх — 1, цыганскіх — 1, павышаных беларускіх — 4, яўрэйскіх — 6, латышскіх — 1 [29].

Пасля ўтварэння Заходняй вобласці сетка нацыянальных школ вырасла і складала ў 1929/30 навучальным годзе "134 адзінкі першай ступені і 20 школ павышаных з ахопам 3160 чалавек". Далей рост іх няўхільна павялічваўся да сярэдзіны 30-ых гадоў. Характэрна, што органамі адукацыі вялася двайная статыстыка: агульны ўзровень адукацыі і ўзровень адукацыі на роднай мове. У пачатковай школе ў 1929/30 навучальным годзе з 45 000 дзяцей школьнага ўзросту на роднай мове навучалася 6828, або 15,1% з агульнай колькасці дзяцей школьнага ўзросту. Па сярэднім звяну гэта лічба складае 1360 чалавек. У 1932/33 навучальным годзе ў школах першай ступені на роднай мове навучалася 13 210 чалавек, а ў павышанай — 3959 [30].

У 1929/30 навучальным годзе на Беларусі налічвалася 21 латышская школа, а ў 1934/35 — 24. У 1930 г. у латышскіх школах навучалася 77% дзяцей латышоў. Гэта самы высокі паказчык за ўсе гады. У наступным, 1931 г., было ахоплена нацыянальнай школай ужо 67% дзяцей [31]. На патрабаванні латышоў выпісаць настаўнікаў з Рыгі савецкая ўлада ішла неах-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вотна, яна бачыла ў іх шпіёнаў, дыверсантаў і г.д. Таму галоўнымі цэнтрамі падрыхтоўкі настаўнікаў для пачатковых і сямігадовых школ заставаліся Масква і Ленінградскі педтэхнікум.

Шмат латышскіх настаўнікаў пацярпела ў гады масавых рэпрэсій. Так, дырэктар ужо адзначанай Унаўскай школы Лёзненскага раёна Вейс Георгій Іванавіч, ураджэнец вёскі Фізінкі Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці, член КПСС, па пастанове камісіі НКУС і Пракуратуры СССР ад 21.01.1938 г. быў прыгавораны да растрэлу. Рэабілітаваны ў 1957 г. [32].

Пастаяннай праблемай для кіраўнікоў пададдзела і нацсекцый з'яўлялася надзвычай цяжкая сітуацыя з памяшканнямі для нацыянальных школ. "Становішча са школьнымі будынкамі для нацыянальных меншасцей катастрафічнае" [33] – гэта канстатацыя характэрна для 1919 г., для 20-ых і 30-ых гадоў. Бадай, забеспячэнне прыстасаванымі будынкамі і падрыхтаванымі кваліфікаванымі настаўнікамі было галоўным у вырашэнні пытання нацыянальнай асветы і адукацыі. У Кастрычніцкай воласці Бабруйскага павета латышы ніяк не маглі вызначыцца, што для іх важней — царква ці школа. Таму будынак царквы штогод пераходзіў з рук у рукі і толькі ў 1925 г. быў канчаткова перададзены пад школу. Латсекцыя загадала лютаранскаму пастару Швальбэ вызваліць памяшканне [34].

Акрамя гэтага, прыходзілася вырашаць і іншыя шматлікія пытанні, звязаныя з арганізацыяй і дзейнасцю нацыянальных школ і іншых культурна-асветніцкіх устаноў. Пра гэта сведчаць справаздачы нацыянальных секцый: "Неабходна хадайнічаць перад аддзелам адукацыі і перад зямельным аддзелам Смаленскага павета наконт адвядзення пад латышскую школу ўчастка зямлі, вырашыць пытанне пра рамонт часовага памяшкання школы, а таксама пра абсталяванне і забеспячэнне мэбляй, пра адкрыццё бібліятэк пры школах, пра набыццё падручнікаў і навучальных дапаможнікаў..." [35]. Пра разнастайнасць абавязкаў і клопатаў нацменаўскіх арганізацый у справе адукацыі гавораць пратаколы паседжанняў пададдзелаў і камісій нацыянальных меншасцей, дзе пералічваюцца і першачарговыя, і перспектыўныя пытанні: "Пра абутак для вучняў, пра гарачае снеданне для школьнікаў, пра пашкоджанне дзецьмі школьнай маёмасці, пра выбары камісіі па рамонту школы, пра абсталяванне інтэрната для латышскіх работнікаў асветы, пра памяшканне пададдзела асветы нацменшасцей і г.д." [36].

У значнай ступені цяжкасці па развіцці нацыянальнай адукацыі вызначаліся неспрыяльнымі ўмовамі грамадзянскай вайны, разрухай у краіне. Былі, аднак, і іншыя прычыны, якія перашкаджалі разгортваць работу на месцах у галіне нацыянальнай адукацыі. Адна з іх — недакладнасць ва ўліку нацыянальных меншасцей, якія жылі на Беларусі і ў Заходняй вобласці. "На жаль, ГубАНА не мае дакладных звестак адносна нацыянальнага складу губерні і адносна патрэбы ў абслугоўванні іх на роднай мове. Асабліва гэта мае дачыненне да латышскага і чэшскага насельніцтва, якое, згодна апошнім перапісам 1926 года, не было поўнасцю выяўлена", — гаворыцца ў справаздачы Гомельскага аддзела народнай адукацыі за 1927 г. [37]. Гэта ж пацвярджае вытрымка з пратакола нарады па арганізацыі Савета асветы беларусаў: "Па словах Агейчыка (першага загадчыка беларускай секцыі пры Смаленскім ГубАНА), ёсць 120 тысяч, а па звестках Т.Ільенка (супрацоўнік ГубАНА), — беларусаў няма. Агейчык патрабуе адкрыць каля 200 беларускіх школ, таму што, калі яму верыць, ёсць пад 30 000 дзяцей. Аднак такая лічба выклікае сумненні, і таму ГубАНА разаслаў цыркуляры для ўліку сапраўднай колькасці беларусаў і для выяснення патрэбы стварэння беларускіх школ. Агейчык — нацыяналіст, беспартыйны, неабходна яго замяніць партыйным таварышам" [38]. Кажучы пра беларускае насельніцтва ў Смаленскай губерні, варта адзначыць, што работа сярод беларусаў аказалася найбольш складанай для мясцовых органаў. Калі правесці хоць бы павярхоўны аналіз становішча розных нацыянальных устаноў, то адразу кінецца ў вочы малая колькасць беларускіх культасветустаноў у 20-ыя гады: "Усяго па губерні (1925 год) яўрэйскае насельніцтва мела 6 хат-чытальняў, 10 чырвоных куткоў, 5 лікпунктаў, 1 клуб; ла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тышы — 8 хат-чытальняў, 27 чырвоных куткоў, 1 клуб; беларусы — 3 хаты-чытальні, 3 чырвоныя куткі, 1 лікпункт" [39]. І гэта тады, калі, паводле статыстыкі, колькасць яўрэйскага і беларускага насельніцтва больш-менш сувымерная, а колькасць латышоў, якія жылі на Смаленшчыне, значна меншая.

Адна з самых складаных праблем не толькі ў галіне культуры і адукацыі — гэта прыярытэт ідэалогіі, палітыкі над іншымі жыццёва важнымі пытаннямі быцця нацыянальных меншасцей. У 1921 г. ствараюцца нацыянальныя секцыі і бюро пры агітацыйна-прапагандысцкіх аддзелах парткамаў. Работа іх строга рэгламентавалася і кантралявалася шматступеннай вертыкаллю. У палажэнні аб іх арганізацыі гаварылася: "Нацсекцыі арганізуюцца губкомамі і зацвярджаюцца ЦК КП(б)Б. Уся перапіска, у тым ліку і на нацыянальнай мове, вядзецца праз агульную рэгістратуру парткомаў. Пры паступленні папер нацменшасцей у выпадку неабходнасці ў секцыі ўстанаўліваецца ўнутраная рэгістратура" [40]. Як бачым, кантроль строгі і ўсеаб'емны. Нічога не павінна было скажаць правільную лінію партыі. Паказальным з'яўляецца ўказанне яўрэйскага бюро губкама РКП(б) аб забароне рэгістрацыі яўрэйскага гуртка: "Яўрэйскае бюро мяркуе, што створаны ў мястэчку Рудня яўрэйскі гурток... рэгістраваць немэтазгодна... Адмова ў рэгістрацыі павінна быць зроблена толькі па фармальных прычынах, такіх, як адсутнасць статуса, зарэгістраванага ў адміністрацыйным аддзеле губвыканкама. На гэтай падставе ВВК (валасны выканаўчы камітэт) павінен забараніць усякую дзейнасць гуртка. Легалізацыя руднянскага гуртка з'явіцца прэцэдэнтам для афармлення такіх самых гурткоў па ўсёй губерні... 20 чэрвеня 1925 г. Сакрэтна" [41].

Пастановай Сакратарыята ЦК КПБ у 1924 г. быў створаны латышскі партыйны цэнтр у Беларусі. Адказным сакратаром латбюро быў прызначаны тав. Клявін [42].

У 1925 г. былі арганізаваны два латбюро пры акружкамах КП(б)Б у Барысаве і Оршы, акружное латбюро ЛКСМБ у Віцебску, латсекцыя пры цэнтральным савеце таварыства "Бязбожнік", 3 нацсельсаветы (Полацк, Бабруйск, Віцебск), 4 хаты-чытальні, 14 чырвоных куткоў, 12 сельскагаспадарчых гурткоў, 4 палітгурткі, 1марксісцкі гурток. Праведзена 5 дэлегацкіх сходаў сялянак-латышак. Стварэнне таварыстваў накшталт "Бязбожніка" дорага каштавала нашай краіне [43].

У дакументах розных гадоў падкрэсліваецца асноўная задача нацыянальнай асветы: "Для вядзення агітацыі і прапаганды сярод працаўнікоў нацменшасцей, для распрацоўкі і пастановы перад партыяй пытанняў савецкага і партыйнага будаўніцтва, выцякаючых з іх бытавых і культурных асаблівасцей..." [44]. На другім, трэцім плане — задачы ўласна асветы, адукацыі, выхавання. У анкетах і характарыстыках, распрацаваных для польскіх, латышскіх і яўрэйскіх работнікаў асветы, спачатку — партыйная прыналежнасць, ідэалагічная вытрыманасць, кароткі пераказ палітычных поглядаў, адносіны да савецкай улады. У канцы — інтарэс да педработы, звесткі аб адукацыі, педстажы, ступені валодання роднай мовай, гэта значыць аб прафесійнай прыгоднасці выхавальніка новай асобы.

Сярод латышоў, што працавалі ў гарадах, вялася не менш актыўная работа. На Беларусі ў той час існавалі два клубы. Адзін знаходзіўся ў Віцебску, дзе да 1931 г. налічвалася каля 2 тыс. рабочых і служачых-латышоў. Гэты клуб працаваў з 1917 г. і быў вельмі папулярны. На жаль, празмерная палітызацыя ў яго дзейнасці разваліла добрую справу. У справаздачах за 1931 г. звесткі пра гэтую ўстанову гучаць так: "...Неабходна адзначыць, што работа клуба ў апошні час значна аслабела. У сучасны момант мы маем такое становішча, што ў клубе ўсяго 87 чалавек. Сярод іх: рабочых — 45 чалавек, служачых — 31 чалавек, інвалідаў і хатніх гаспадынь — 11" [45].

Падобны латышскі клуб быў створаны і ў Смаленску. У яго рабоце прымала ўдзел больш за 3 тыс. латышоў, у тым ліку і сялян [46].

Няма таксама актыву, які змог бы ўцягнуць рабочых у актыўную працу. Напрыклад, клуб не займаецца такімі пытаннямі, як інтэрнацыянальнае выхаванне, не завастрае ўвагу на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

барацьбе з шавінізмам розных колераў, антысемітызмам і г. д. У планах адсутнічае пытанне творчага характару, як, напрыклад, сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Вось якіх накірункаў працы сярод латышоў чакала ад клуба Савецкая ўлада.

Дзеля паўнацэннага абслугоўвання працоўных з 25 верасня 1931 г. пры Беларускім рэспубліканскім радыёцэнтры пачала трансліравацца радыёперадача на латышскай мове. Рэгулярнае вяшчанне вялося з 1 кастрычніка 12 разоў у месяц па 30 хвілін. У штаце перадачы быў спецыяльны рэдактар радыёгазеты і сакратар. Большасць радыёпаведамленняў насіла палітычны характар [47].

Акрамя палітычных мерапрыемстваў у латышскіх пасяленнях праводзіліся розныя конкурсы, напрыклад, на лепшую вёску і інш. Такім шляхам можна было выявіць дасягнутыя вынікі ў галіне савецкага будаўніцтва: прааналізаваць работу сельсавета, школы, палітасветустаноў, кааперацыі, азнаёміць з жыццём нацыянальных меншасцей шырокія масы працоўных Беларусі. Гэтыя мерапрыемствы падказвалі шляхі вырашэння праблем у галіне культуры і сацыяльнай работы [48].

Памыляецца чалавек, у якога пры слове "хата-чытальня" ўзнікнуць асацыяцыі з кнігамі, газетамі, гучнымі чыткамі і інш. Займаліся, вядома, і гэтым нацменаўскія загадчыкі хат-чытальняў, аднак галоўнай іх задачай, на думку ўлад, было правядзенне правільнай палітычнай лініі сярод нацыянальных меншасцей, "удзельнічаць самому і ўзнімаць масы на гаспадарча-палітычныя кампаніі". У дакументах часта сустракаецца вось такая ацэнка працы загадчыкаў нацыянальных хат-чытальняў: "Хаты-чытальні працуюць замкнёна, "культурнічаюць", не з'яўляюцца цэнтрамі арганізацыі мас у палітычных і гаспадарчых задачах" [49].

Для латышскіх калоній Аршанскай акругі (387 латышоў), Барысаўскай – 400, Бабруйскай – столькі ж, характэрны нізкі культурны ўзровень, адсутнасць кадраў культаасветработнікаў. Літаратуры на роднай мове зусім няма. "Хатнікі" карыстаюцца рускімі выданнямі [50].

1. Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства. – М., 1918. – С. 835.
2. Памяць. Лёзненскі раён. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя імя П.Броўкі. – 1992. – С. 37.
3. *Тугай У.В.* Латышы на Беларусі. – С. 80.
4. Там жа. – С. 80–81.
5. *Макарова Г.Н.* Народный комиссариат по делам национальностей РСФСР. Исторический очерк. – Мн., 1987. – С. 19.
6. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей ДАВВ).
7. ДАВВ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 322. Арк. 53.
8. Отчет Витебского губернского Исполкома к X съезду Советов. – Витебск, 1922. – С. 428.
9. ДАВВ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 322. Арк. 58.
10. ДАВВ. Ф. 10050. Воп. 1. Спр. 481. Арк. 287.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). Ф.4. Воп. 12. Спр. 11. Арк. 4.
12. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 11. Арк. 148.
13. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 6. Арк. 72.
14. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 14. Арк. 70.
15. *Слабін У., Шпак Л.* Латышы на Віцебшчыне // Культура. – № 31. – 6–12 жніўня 1996 г.
16. *Дзядзінкін А.Л.* Культурна-асветніцкая дзейнасць органаў адукацыі Віцебскага Губвыканкама ў адносінах да нацыянальных меншасцей. У зб.: Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць, 6–7 снежня 2001 г. Мінск, 2001. – С. 200.
17. Дзяржаўны архіў Смаленскай вобласці (далей ДАСВ) Ф. 19. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 19.
18. ДАСВ. Ф. 2360. Воп. 1. Спр. 812. Арк. 37.
19. НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 107. Арк. 148.
20. *Шкільтэр К.* Латышскі селянін на Беларусі да і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. – Мн., 1935. – С. 130.
21. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 26. Арк. 1.
22. Там жа. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 26. Арк. 2.
23. Всесоюзная перепись населения 1926 г. Т. 10. Белорусская Советская Социалистическая Республика. Отдел 1. Народность. Родной язык. Возраст. Грамотность. – М., 1928. *Падлічана аўтарам.*
24. *Шкільтэр К.* Латыскія колёніі... – С. 130–151.
25. ДАСВ. Ф. 719. Воп. 1. Спр. 1273. Арк. 67.
26. НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 98. Арк. 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

27. ДАСВ. Ф. 2350. Воп. 2. Спр. 45. Арк. 74.
28. Там жа. Ф. 1207. Воп. 1. Спр. 1706. Арк. 2.
29. Там жа. Ф. 2360. Воп. 1. Спр. 90. Арк. 76.
30. ДАСВ. Ф. 2360. Воп. 1. Спр. 2073. Арк. 38.
31. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 38. Арк. 6.
32. Памяць. Нараўлянскі раён. – Мн.: БелТА, 1998; Памяць. Лёзненскі раён. – Мн., 1992. – С. 91.
33. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 10. Арк. 13.
34. Там жа.
35. ДАСВ. Ф. 19. Воп. 1. Спр. 474. Арк. 12.
36. НАРБ. Ф. 3. Спр. 26. Воп. 1. Арк. 27.
37. Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці (далей ДАГАГВ). Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2092. Арк. 236–247; НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 92. Арк. 1–18.
38. ДАСВ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 2931. Арк. 243.
39. Там жа. Ф. 19. Воп. 1. Спр. 194. Арк. 23.
40. ДАГАГВ. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 794. Арк. 1–18.
41. ДАСВ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 2250. Арк. 5.
42. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 1. Арк. 2.
43. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 1. Арк. 10.
44. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 20. Арк. 33.
45. *Тугай У.В.* Указ. сач. – С. 106; НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 6. Арк. 44.
46. ДАСВ. Ф. 19. Воп. 1. Спр. 4746. Арк. 11–87.
47. *Тугай У.В.* Указ. сач. – С. 107; НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 76. Арк. 2–54.
48. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 5. Арк. 8.
49. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 4. Арк. 11.
50. НАРБ. Ф. 4. Воп. 12. Спр. 3. Арк. 12–18.

ДЫДАКТЫКА І ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ

Віктар Вабішчэвіч, настаўнік сярэдняй школы № 1 г. Давыд-Гарадка

371.011.5+9(Б)(07)

Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне вучняў у працэсе выкладання гісторыі Беларусі

Адной з найбольш актуальных праблем выхавання з'яўляецца выхаванне грамадзяніна, патрыёта нашай краіны, здольнага аддаваць усе свае сілы і веды на карысць нашай Бацькаўшчыны. У гэтым вельмі вялікае значэнне мае курс гісторыі Беларусі. Сярод галоўных задач вывучэння гісторыі праграма называе садзейнічанне выхаванню «свядомага чалавека-гуманіста, патрыёта і інтэрнацыяналіста, адказнага грамадзяніна, які ведае і паважае гісторыю і культуру свайго народа, з разуменнем і добразычлівасцю ставіцца да іншых народаў». У тлумачальнай запісцы да праграмы адзначаецца, што вывучэнне курса гісторыі Беларусі «павінна садзейнічаць нацыянальна-культурнаму адраджэнню беларускага народа праз пазнанне непаўторнасці яго гістарычнага шляху, матэрыяльнай і духоўнай культуры, праз усведамленне яе нацыянальнай каштоўнасці ў сукнепці славянскай, еўрапейскай і сусветнай культуры». Гэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ